ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

1988
ЧАЦВЕР
8
СНЕЖНЯ
№ 33 (1591)

У наступным нумары чытайце:

●●●

— Заўтра паеду ў Маладзечна,— сказаў ён і зашчоўкнуў дыпламат. Дыпламат прыемна шапацеў біжутэрыяй, значкамі і запалкавымі карабкамі, упрыгожанымі карцінкамі з часопіса мод.— Дзесяць працэнтаў ад зароблена — маё...

Аўтару аднаго з матэрыялаў, якія будуць змешчаны ў наступным нумары, фінансавыя цяжкасці ўжо не пагражаюць. Ён — член кааператыву па рэалізацыі прадукцыі кааператываў.

Тыя, для каго такое пытанне пакуль існуе, дзеляцца сваімі думкамі ў наступным нумары.

Беларускі універсітэт

ТЭЛЕТАЙП

УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА

У ПАРТЫЙНЫМ КАМІТЭЦЕ

універсітэта ствараецца камісія па выяўленню імён выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта, якія былі падвергнуты рэпрэсіям у 30-х — пачатку 50-х гадоў. Для яе паспяховай работы неабходна дапамога ўсіх, хто мае канкрэтныя факты. У 207-м пакоі галоўнага корпуса прымаюцца прапановы аб саставе камісіі, змесце яе дзейнасці.

Работа камісіі будзе рэгулярна асвятляцца на старонках газеты «Беларускі універсітэт».

ПАРТКОМ.

«ІНТЭЛІГЕНЦЫЯ І САЦЫЯЛІЗМ»

— тэма наступнага пасяджэння клуба «Палітыкус», якое адбудзецца 12 снежня а 20-й гадзіне. На парадак дня выносяцца пытанні: інтэлігенцыя і яе роля ў рэвалюцыйным працэсе; дзейнасць інтэлігенцыі ў гады застою і ці можа стаць яна кіруючай сілай у час перабудовы.

ДА 70-ГОДДЗЯ

ўтварэння БССР кніжны кіёск галоўнага корпуса прапануе наступныя выданні: «Материалы XIX партконференции Коммунистической партии Советского Союза», «Материалы XXX съезда Коммунистической партии Белоруссии», «Белорусская ССР. Энциклопедия в 5-ти томах», Войнов А. А. «История архитектуры Белоруссии. Советский период», «Свод памятников истории и культуры БССР», «Энциклопедия литературы и искусства Белоруссии, т. 2» і іншыя.

Т. ДОЎНАР.

«РЭАБІЛІТАВАНЫЯ КНІГІ»

— так называецца выстаўка, якая праходзіць зараз у зале даведачна-бібліяграфічнага і інфармацыйнага абслугоўвання чытачоў фундаментальнай бібліятэкі БДУ (галоўны корпус, 2-гі паверх). Супрацоўнікі бібліятэкі чакаюць вас з 9.30 да 17.00 гадзін.

З. МІХНЕВІЧ.

НЯЛЁГКАЯ БАРАЦЬБА

чакала студэнта II курса юрыдычнага факультэта Ф. Агаева ў Ленінградзе, дзе адбыліся спаборніцтвы на Кубак СССР па барацьбе самба. І ўсё ж ён здолеў паказаць сапраўднае майстэрства і падняцца на вышэйшую ступень п'едэстала гонару.

В. РУДЗЯНКОЎ.

РОДНАЯ МОВА

СТВОРАНА КАМІСІЯ

СЁННЯ, напэўна, няма праблемы, якая абмяркоўвалася б так жыва і зацікаўлена, як захаванне і пашырэнне выкарыстання беларускай мовы. Ды справа не толькі ў мове. Дрэнна ведаем мы беларускую гісторыю, культуру. І прабелы патрэбна неадкладна ліквідаваць. Аб гэтым ішла размова на пасяджэнні, на якое былі запрошаны прадстаўнікі рэктарата, парткома, факультэтаў, камітэта камсамола універсітэта. Усе, ад прафесара да студэнта, былі заклапочаны тым, што будучыя маладыя спецыялісты — выпускнікі Беларускага дзяржаўнага універсітэта — дрэнна валодаюць роднай мовай. Асабліва гэта датычыць тых, хто збіраецца працаваць настаўнікам.

Прафесар філалагічнага факультэта Л. М. Шакун паведаміў прысутным, што пытанне аб дадатковых мерах па развіццю беларуска-рускага двухмоўя ў навучальных установах рэспублікі разглядалася на пасяджэнні калегіі Міністэрства народнай адукацыі БССР. Зацікаўленую размову вялі рэктары інстытутаў, якія рыхтуюць настаўнікаў, пісьменнікі, прадстаўнікі прэсы, работнікі культасветустаноў і г. д. Усе згадзіліся, што выкладанне беларускай мовы, літаратуры, гісторыі БССР патрэбна пашырыць. Прычым, не толькі на гуманітарных спецыяльнасцях.

Гэта ідэя была падтрымана і членамі універсітэцкай камісіі па распрацоўцы мерапрыемстваў па пашырэнню беларуска-рускага двухмоўя. Прапанавана гістфаку, журфаку і філфаку кожнаму асобна, а астатнім факультэтам усім разам у двухтыднёвы тэрмін падаць у рэктарат прыкладны пералік мерапрыемстваў, якія яны лічаць галоўнымі і першаступеннымі. Дарэчы, канчатковы варыянт будзе прыняты толькі пасля іх абмеркавання ў прэсе. Так што, калі вы не абыякавыя да лёсу роднага слова, рыхтуйце свае заўвагі — вам будзе прадстаўлена трыбуна газеты «Беларускі універсітэт». Магчыма, у каго-небудзь яны ўжо гатовы — тады вас чакаюць у рэктараце. Калі ласка, прапаноўвайце, спрачайцеся, абмяркоўвайце.

З. АЛЯКСАНДРАВА.

◆◆◆

СПРАВЫ школьнага камсамола, праблемы кінематографа і маладзёжных груповак у полі зроку студэнткі факультэта журналістыкі Ганны Соусь. Першы курс для многіх толькі пачатак, а для яе — гэта працяг сур'ёзнай работы над сабой і сваім майстэрствам. З матэрыяламі Ганны маглі пазнаёміцца чытачы «Знамени юности», «Чырвонай змены», часопіса «Крыніца».

Фота С. ГРЫЦА.

◆◆◆

ПЕРАБУДОВА,
ЯКАЯ РАЗГАРНУЛАСЯ Ў НАШАЙ КРАІНЕ, ВЫКЛІКАЛА НЕЗВЫЧАЙНЫ ПАДЪЁМ САЦЫЯЛЬНА-ПАЛІТЫЧНАЙ АКТЫЎНАСЦІ ЛЮДЗЕЙ.
ЗАКАНАМЕРНА,
ШТО МОЛАДЗЬ
НЕ МОЖА СТАЯЦЬ Ў БАКУ АД УСІХ ГЭТЫХ ПАДЗЕЙ.
Ў СУЧАСНЫХ УМОВАХ
АДЧУВАЕЦЦА НЕАБХОДНАСЦЬ Ў ДЗЕЙНАСЦІ КАМСАМОЛА,
ЯК ПАЛІТЫЧНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ МОЛАДЗІ.
ФАРМАЛЬНА, ПА СТАТУТУ, КАМСАМОЛ З'ЯЎЛЯЕЦЦА ТАКОЙ АРГАНІЗАЦЫЯЙ.
РЭАЛЬНА ЁН МОЖА СТАЦЬ ПАЛІТЫЧНАЙ АРГАНІЗАЦЫЯЙ ТОЛЬКІ ПРЫ НАЯЎНАСЦІ ПРАГРАМЫ ВЛКСМ,
ДЗЕ ПАВІННА ЗНАЙСЦІ АДЛЮСТРАВАННЕ КАНСТРУКТЫЎНАЯ ПАЗІЦЫЯ МОЛАДЗІ ПА САМАМУ ШЫРОКАМУ КОЛУ ПЫТАННЯЎ І ПРАБЛЕМ.
ПА УСЁЙ КРАІНЕ ПАКУЛЬ СТЫХІЙНА І ПА ІНІЦЫЯТЫВЕ З МЕСЦ РАЗГАРНУЛАСЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ПА ВЫПРАЦОЎЦЫ САЦЫЯЛЬНА-ПАЛІТЫЧНЫХ ПЛАТФОРМ І ПРАГРАМ ДЗЕЙНАСЦІ ПЯРВІЧНЫХ КАМСАМОЛЬСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ.
ПЛАТФОРМА КАМСАМОЛА МДУ ІМЯ М. В. ЛАМАНОСАВА «НАША ПАЗІЦЫЯ»,
З ЯКОЙ ВЫ ПАЗНАЁМІЦЕСЯ НІЖЭЙ, ПА СУТНАСЦІ,
«ПЕРШАЯ ЛАСТАЎКА» ГЭТАГА РУХУ.
УВАЖЛІВА АЗНАЁМСЯ З ГЭТЫМ ДАКУМЕНТАМ,
БО ВЫКАЗАНЫЯ Ў ІМ ПАЛАЖЭННІ Ў МНОГІМ АДЛЮСТРОЎВАЮЦЬ ПРАБЛЕМЫ НЕ ТОЛЬКІ КАМСАМОЛА МДУ,
АЛЕ І БДУ.

НАША ПАЗІЦЫЯ • НАША ПАЗІЦЫЯ • НАША

АСУДЖАЕМ ТЭОРЫЮ І ПРАКТЫКУ СТАЛІНІЗМУ І ПЕРЫЯДУ ЗАСТОЮ

Моладзь атрымлівае ў спадчыну грамадства, створанае папярэднімі пакаленнямі. Нельга перабудаваць грамадства, не вызначыўшы сваіх адносін да яго мінулага. Таму адносіны да сталінізму і «брэжнеўскага» застою з'яўляюцца адным з важнейшых крытэрыяў пазіцыі любога члена грамадства і моладзі ў прыватнасці.

Вынікі сталінізму аказаліся катастрафічнымі.

Затым надышоў перыяд «адлігі», выкрыцця культу асобы, рэабілітацыі ахвяр сталінскіх рэпрэсій, развіцця дэмакратыі ў сярэдзіне — канцы 50-х гадоў.

Аднак на змену фізічным рэпрэсіям прыйшло падаўленне ініцыятывы і творчасці мас, абмежаванне палітычных правоў і свабод грамадзян. Адбылося маральнае разлажэнне вялікай групы кіруючых партыйных, дзяржаўных і камсамольскіх работнікаў. Расцвілі бюракратызм і карупцыя. Рэальнымі ўладальнікамі грамадскай уласнасці аказаліся групы, чыноўнікі партыйнага і дзяржаўнага апарату.

Нарастала грамадска-палітычная пасіўнасць людзей, індывідуалізм. Да пачатку 80-х гадоў намаганнямі камандна-адміністрацыйнай сістэмы ўдавалася толькі рыўкамі прасоўвацца наперад у развіцці эканомікі, што павялічвала наша адставанне ад развітых краін. Гэтыя негатыўныя працэсы паставілі краіну і ідэалы сацыялізму на край бездны.

Дэфармацыя сацыялізму і моладзь. Сталінізм і гады застою негатыўна адбіліся на моладзі і яе арганізацыі. ВЛКСМ з палітычнай арганізацыі ператварыўся ў «пажарную каманду», якая пастаўляе моладзь на розныя мерапрыемствы.

Камсамольцы былі адхілены ад фарміравання не толькі органаў дзяржаўнай улады, але і ўласных выбарных органаў, што нарадзіла палітычны інфантылізм. Была створана атмасфера «неабходнасці членства ў ВЛКСМ» як гаранта забеспячэння неабходнага мінімальнага дабрабыту, працаўладкавання ў грамадстве. Склаліся своеасаблівыя крытэрыі грамадска-актыўнага камсамольца, які кідаецца па «першаму закліку» «на латанне дзірак і прарэх», не задумваецца, а ці патрэбна гэта рабіць у прынцыпе, праяўляе актыўнасць у служэнні склаўшайся сістэме.

Аднак нельга не сказаць аб тым, што і сярод моладзі многія задумваліся аб неабходнасці змен у грамадска-палітычнай сістэме, не жадаючы па загаду праяўляць энтузіязм і актыўнасць.

Інтарэсы абнаўлення жыцця нашага грамадства патрабуюць сумленнай, навукова абгрунтаванай ацэнкі мінулага, мэтанакіраванай, паслядоўнай работы ў гэтым напрамку. У прыватнасці, неабходна:

1. Вывучэнне магчымасці існавання ў 20—30-я гады альтэрнатывы сталінізму. Аб'ектыўны аналіз і давядзенне да шырокага кола грамадскасці той ролі, якую адыграла сталінскае і брэжнеўскае асяроддзе ў правядзенні палітыкі, дыскрэдытаваўшай ідэалы сацыялізму.

2. Аб'яўленне сталінскіх рэпрэсій злачынствам супраць чалавека і чалавечнасці, ушанаванне памяці ахвяр рэпрэсій.

3. Давядзенне працэсаў юрыдычнай і палітычнай рэабілітацыі да канца, у тым ліку і асоб, якія пакутавалі ў гады застою за свае погляды.

4. Патрыятычнае выхаванне моладзі патрэбна праводзіць не толькі на ваенных прыкладах, але шляхам захавання памяці і вывучэння гісторыі гераічнай барацьбы супраць сталінскіх скажэнняў сацыялізму.

МЫ ЗА ПЕРАБУДОВУ

Сёння ў асноўным склалася канцэпцыя перабудовы, якая ўключае ў сябе пашырэнне галоснасці, дэмакратызацыю жыцця, станаўленне новага палітычнага мыслення, рэформу эканамічнай і палітычнай сістэм.

Моладзі важна вызначыць сваё месца ў гэтым, патрэбны канкрэтныя дзеянні.

«Мітынгавая дэмакратыя». У сацыялістычнай дзяржаве неабходна забяспечыць права грамадзян і грамадскіх арганізацый на волевыяўленне (арганізацыя мітынгаў, збор подпісаў і г. д.).

Адміністрацыйныя меры, прадугледжаныя законам, павінны выкарыстоўвацца толькі ў крайнім выпадку.

Адначасова камітэт камсамола лічыць, што заканадаўчы парадак, які існуе, і канкрэтнае яго прымяненне недасканалыя і патрабуюць перагляду.

Для ажыццяўлення рэальнага плюралізму меркаванняў трэба вызначыць заканадаўчы статус розных грамадскіх арганізацый і добраахвотных аб'яднанняў, прычым у выніку ўсенароднага абмеркавання. У той жа час ідэя прававой дзяржавы не мае нічога агульнага з ўседазволенасцю і анархіяй. Палітычныя акцыі павінны ажыццяўляцца ва ўстаноўленым парадку.

Інтэрнацыяналізм. Перабудова і дэмакратызацыя закранула і такую доўгі час закрытую сферу, як адносіны паміж народамі і нацыянальнасцямі. Галоўнае тут тое, што нельга заганяць нацыянальныя праблемы ўглыб. Пры іх вырашэнні неабходна забяспечыць раўнапраўе ўсіх нацыянальнасцей, павагу нацыянальных традыцый, асаблівасцей нацыянальнай культуры. Камітэт камсамола пры вырашэнні нацыянальных праблем лічыць недапушчальным нагнятанне нацыяналізму і напружанасці паміж грамадзянамі, дзяржаўнымі і партыйнымі арганізацыямі.

КАМСАМОЛ: ВЕДАМСТВА ПА СПРАВАХ МОЛАДЗІ ЦІ ЛІДЭР МАЛАДЗЁЖНАГА РУХУ

Палітычны поспех арганізацыі напрамую залежыць ад актуальнасці праблем, якія яна імкнецца вырашыць, і выбару спосабаў іх вырашэння. На сёння камсамолу вельмі важна, па-першае, забяспечыць важкі ўдзел моладзі ў палітычным жыцці краіны і, па-другое, дасягнуць паслядоўнасці ў вывучэнні і адстойванні інтарэсаў маладых людзей у пытаннях вучобы, навуковага і прафесійнага росту, маладой сям'і, творчага самавыражэння і г. д.

Для гэтага ў кожнай камсамольскай арганізацыі ёсць сродкі. Напрыклад, магчымасць удзельнічаць у падрыхтоўцы і прыняцці дзяржаўных і адміністрацыйных рашэнняў, аж да

(Працяг на 2-й стар.).

ТВАЕ ВЫКЛАДЧЫКІ, УНІВЕРСІТЭТ.

ВЕРНАСЦЬ РОДНАМУ СЛОВУ

ТАК УЖО вядзецца, што сярод вучоных мы найчасцей вылучаем імёны тых, хто мае высокія тытулы, ганаровыя званні і дзяржаўныя адзнакі. Ганарымся акадэмікамі і прафесарамі і ў лепшым выпадку сціпла ўспамінаем радавых выкладчыкаў, кандыдатаў навук, дацэнтаў. Толькі і сярод іх сустракаюцца людзі, чые імёны не могуць быць не ўпісаны ў гісторыю беларускай навукі, хто нястомна клапоціцца пра маладое папаўненне — будучыню народнай асветы, навукі і культуры.

Больш трыццаці гадоў працуе на кафедры беларускай мовы філалагічнага факультэта дацэнт Еўдакія Сцяпанаўна Мяцельская. Ад сарамлівай аспіранткі ў 1952 годзе да аднаго з вядучых беларускіх дыялектолагаў, аўтарытэтнейшага знаўцы народнай фразеалогіі — такі шлях сялянскай дачкі са Случчыны. Прыродная сціпласць, незвычайная працавітасць і няўрымслівасць, строгая самадысцыпліна і ўлюбёнасць у сваю прафесію — усё гэта дазволіла Еўдакіі Сцяпанаўне стаць аўтарам добрага дзесятка навуковых манаграфій, слоўнікаў, вучэбных дапаможнікаў для вышэйшай і сярэдняй школы. Кватэра Е. С. Мяцельскай і Я. М. Камароўскага (вернага памочніка і мужа — таксама дацэнта кафедры беларускай мовы) па-ранейшаму нагадвае даследчую лабараторыю, у якой ні на хвіліну не спыняецца навуковы пошук. Вось і зараз пад іх кіраўніцтвам падрыхтаваны і здадзены ў выдавецтва «Слоўнік радзімы Якуба Коласа» — буйнейшае ў беларускім мовазнаўстве даследаванне канкрэтнай народнай гаворкі.

Цяжка знайсці на карце рэспублікі месца, дзе б не пабывала са студэнтамі ў час дыялекталагічнай практыкі дацэнт Е. С. Мяцельская. Не адно пакаленне выпускнікоў філфака ўспамінае яе як шчырага дарадцу і старэйшага таварыша-куратара, проста цікавага субяседніка.

А яшчэ Еўдакія Сцяпанаўна — маці траіх дзяцей. І хоць не сталі яны філолагамі, але ўсе атрымалі вышэйшую адукацыю, з любоўю адносяцца да беларускага слова, а некаторыя рыхтуюць дысертацыі.

Успамінаецца душэўная заклапочанасць і шчырае хваляванне за лёс народнай мовы складальнікаў хрэстаматыі па беларускай дыялекталогіі: «Пройдзе, магчыма, не так многа часу, і пад уплывам літаратурнай жывая мова народа зменіцца — такі няўхільны і натуральны закон яе развіцця. Калі не занатаваць яе сёння, яна можа бясследна знікнуць заўтра. Для будучых пакаленняў, для навукі можа знікнуць тое, што складае непаўторную каштоўнасць народа, значную частку яго духоўнай культуры...» Гэта хваляванне за лёс роднага слова выяўляецца ў кожным пражытым дні вучонага, у кожным радку летапіснай гісторыі роднага найменя. Няхай жа доўжыцца гэты радок, расце і напаўняецца, захапляе кожнага шчырасцю і непасрэднасцю, трапнасцю і арыгінальнасцю!

М. ПРЫГОДЗІЧ,
Г. ЮРЧАНКА.
Фота АЎТАРАЎ.

СПРАВЫ ФГП

Чаму лектары не ў модзе?

— Ты адзін? — запытаў у мяне кіраўнік (на грамадскіх пачатках) школы маладога лектара В. Л. Ананьеў.

— Не, тут яшчэ шэсць чалавек.

— Нічога сабе! — і горкая іронія пачулася ў яго словах...

Ужо каторы год школа маладога лектара ФГП не працуе на поўны моц. Асноўная прычына — няма каго вучыць. У гэтым годзе лектарскую школу скончыла толькі пяць чалавек. Не лепшае становішча будзе і ў наступным, бо ў адзін з лістападаўскіх дзён на заняткі прыйшло ўсяго шасцёра студэнтаў.

Зараз нярэдка можна ўбачыць, як студэнты паміж сабою горача абмяркоўваюць самыя разнастайныя пытанні, якімі жыве краіна. У спрэчках уздымаюцца сур'ёзныя праблемы, якія патрабуюць добрага аналітычнага асэнсавання. Але чаму такая актыўнасць у калідорах і курылках не спрыяе павелічэнню колькасці жадаючых займацца ў школе маладога лектара? Дзе, як не тут, вучыцца майстэрству рыторыкі? На жаль, такі вынік — заканамернасць. Агітацыйнай работы ва універсітэце ніхто не праводзіць. І хоць расклад заняткаў ФГП, з якога можна даведацца нумар аўдыторыі і час наведвання, вывешаны, у ім нельга прачытаць што карыснае дае будучаму спецыялісту тая ці іншая школа. Таму, не заўважаючы «Рэкламнага праспекта», і праходзяць міма яго студэнты, не пазбавіўшыся думкі, што любая форма грамадска-палітычнага навучання забірае нямала вольнага часу і нічога, акрамя нуды, не дае. Хто іх у гэтым пераканае, паспрабаваўшы зацікавіць?

П. ПАПЯЛУШКА,
студэнт факультэта журналістыкі.

АД РЭДАКЦЫІ: Мы звярнуліся за каментарыем да кіраўніка школы маладога лектара В. Л. Ананьева. Вось яго меркаванне:

— Школа маладога лектара падпарадкоўваецца адразу некалькім арганізацыям. Гэта камсамол, таварыства «Веды», ФГП. І ў кожнага з іх свае абавязкі. Таварыства «Веды» забяспечвае вучэбны працэс, камплектаваннем груп займаецца камітэт камсамола, ФГП вырашае тэхнічныя пытанні. Лічу, што камсамол універсітэта ад сваіх абавязкаў самаўхіліўся, не прапагандуючы работу ФГП. Але вядома і тое, што хто жадае, той прыйдзе і будзе займацца. Гэта асабіста датычыць студэнтаў педагагічных патокаў, якія павінны ведаць асновы лектарскага майстэрства.

ЗВАРОТНАЯ СУВЯЗЬ

Мой тэлефон маўчыць

Амаль некрануты стос старых нумароў «Беларускага універсітэта» на незгараемай шафе я ўбачыла адразу. Знаёмы стос — адзіны нумар, які сама па дарозе «закінула» ў камітэт камсамола.

— Старыя, новых няма,— перахапіўшы позірк, тлумачыць сакратар факультэта радыёфізікі і электронікі.

Ведаю — усе новыя паціху сталеюць, а потым старэюць у рэдакцыйнай шафе.

— Чаму вы нас не чытаеце?

— Ведаеце, далёкая ад нас гэта газета.

Калі меркаваць па адказу маўчанню на пытанне пра тое, ці чыталі прысутныя яе — далёкая пераважна ў сэнсе адлегласці.

— Ды стамілі нас журналісты! Я нават «Правду» і «Известия» не чытаю, а ты пра «Беларускі універсітэт».

— Гэта пункт гледжання ўсіх радыёфізікаў?

— Думаю, што большасці.

— Можа, дзеля той меншасці, што лічыць інакш, варта хаця б прывозіць нумар у Шчамысліцу?

— Заўтра камітэт камсамола, пэўна, мы даручым гэта некаму.

Не паспяваю абурыцца ўводным словам са значэннем вельмі малой ступені ўпэўненасці:

— Прабач, мы зараз лаяцца між сабой будзем...

З парога раблю ліхаманкавую спробу ўсталяваць тую самую зваротную сувязь, дзеля якой прыехала:

— Ты пазвоніш у рэдакцыю?

— Добра.

— Тэлефон на апошняй паласе.

— Добра, добра.

Не паспяваю пакрыўдзіцца на абяцанне пазваніць, не замацаванае жаданнем спытаць маё імя і прозвішча. З-за дзвярэй прадстаўляюся.

— У чацвер чакаю званка! Чакаю ў пятніцу, потым у суботу.

Ідзе другі тыдзень.

І. ДЗЯРГАЧ.

ПАЗІЦЫЯ • НАША ПАЗІЦЫЯ • НАША ПАЗІЦЫЯ • НАША

(Працяг. Пачатак на 1-й стар.).

заканадаўчай ініцыятывы, і ўдзел у фарміраванні органаў дзяржаўнай і адміністрацыйнай улады, рашэння шэрагу кадравых пытанняў.

Вылучэнне ў першую чаргу палітычных мэт і задач патрабуе ад камсамола вызначыць свае адносіны да фарміравання органаў улады і навучыцца кампетэнтна распараджацца ёю ў інтарэсах моладзі.

ВЛКСМ трэба актыўна ўдзельнічаць у фарміраванні дэпутацкага корпуса, выходзячы пры гэтым са сваёй платформай, кандыдатамі, ясна выражанай пазіцыяй у адносінах да ўсіх асоб, якія прэтэндуюць на месца ў органах народнай улады.

Аб узаемаадносінах партыі і камсамола. Прымаючы ідэйна-палітычнае адзінства партыі і камсамола, камітэт камсамола выступае за арганізацыйную самастойнасць і самадзейны характар нашага саюза.

Ідэйна-палітычнае адзінства партыі і камсамола павінна рэалізоўвацца на аснове правільнай партыйнай палітыкі, якая б улічвала інтарэсы моладзі, дасягалася б з дапамогай актыўнай пазіцыі камуністаў, працуючых у камсамоле, іх умення весці моладзь за сабой. Партыя і камсамол павінны сумесна выпрацоўваць палітыку моладзі і праводзіць яе праз дзяржаўныя органы.

Арганізацыйная самастойнасць азначае:

— адсутнасць прамых указанняў з боку партыі у адрас камсамольскіх арганізацый і органаў;

— выключэнне ўласных указанняў, установак з боку партыйных кіраўнікоў камуністам, якія працуюць у камсамоле без адпаведнага абгрунтаванага рашэння выбарнага партыйнага органа;

— рэалізацыя на справе магчымасці камуністаў і камсамольцаў звярнуцца ў вышэйстаячую партыйную арганізацыю з правам перагляду рашэнняў ніжэйстаячага партыйнага органа па праблемах моладзі.

Новыя магчымасці камсамола. Цяжка размежаваць палітычную дзейнасць камсамола і дзейнасць яго як грамадскай арганізацыі. Апошнім часам у камсамола з'яўляецца ўсё больш магчымасцей для ажыццяўлення розных інтарэсаў моладзі, развіцця ініцыятывы:

— статус юрыдычнай асобы, уласныя фінансавыя і матэрыяльныя рэсурсы, магчымасць ствараць пры сабе гасразліковыя і кааператыўныя аб'яднанні, якія карыстаюцца ўстаноўленымі льготамі;

— магчымасць весці знешнеэканамічную дзейнасць;

— магчымасць выкарыстання матэрыяльных і іншых сродкаў, што знаходзяцца ў распараджэнні Савецкай улады і грамадскіх арганізацый.

Аб свабодным выхадзе. Яшчэ да XX з'езда ВЛКСМ з'явілася прапанова зрабіць выхад з камсамола свабодным, без адпаведных ацэнак з боку арганізацыі. Гэта прапанова не знайшла падтрымкі. Спрэчкі наконт членства ў ВЛКСМ не сціхаюць да гэтай пары.

У пазіцыі лічыцца асноўным наступнае:

1. У бліжэйшы час атмасферу «неабходнасці членства ў ВЛКСМ» наўрад ці ўдасца ліквідаваць у жыцці грамадства, хоць камсамольская арганізацыя будзе з гэтым становішчам змагацца, так як яна не зацікаўлена ў матывах членства ВЛКСМ, створаных гэтай атмасферай.

2. Грамадска-палітычны характар арганізацыі, злучэнне ў ёй палітычных функцый і функцый клуба па інтарэсах карэнным чынам мяняе ўяўленне аб актыўнасці, пашырае магчымасці і зацікаўленасць кожнага праявіць сябе.

3. У камсамольскай арганізацыі ніхто нікога не трымае. Больш таго, сумленна робіць той, хто адкрыта заяўляе аб сваёй немагчымасці далей заставацца ў радах ВЛКСМ, у адрозненне ад таго, хто не жадае змагацца за абнаўленне свайго саюза, застаецца пасіўным і чакае задавальнення сваіх карыслівых інтарэсаў.

Камсамол і «нефармалы»: супрацоўніцтва, а не канфрантацыя. Камсамол — не адзіная арганізацыя, якая ўздзейнічае на моладзь. Існуюць і часта актыўна працуюць разнастайныя грамадска-палітычныя клубы і аматарскія аб'яднанні моладзі. Неабходна прызнаць, што нямала клубаў і аб'яднанняў узнікла як рэакцыя на фармалізм і бюракратызм камсамола, на няўменне і нежаданне камсамола ставіць і вырашаць найбольш вострыя праблемы, перш за ўсё сацыяльнага плана. Ёсць чаму павучыцца ў клубаў. Камітэт камсамола за адкрыты, канструктыўны дыялог, за тое, каб прыслухоўвацца адзін да аднаго, а не навешваць ярлыкі і ўзводзіць сцены непаразумення і ўзаемнай непрыязнасці. Аднак камсамол не павінен быць «страхой» для любога грамадска-палітычнага аб'яднання або клуба. Павінны існаваць самастойныя арганізацыі са сваімі планамі і задачамі, сваёй праграмай і тактыкай дзеянняў. У адпаведнасці з імі камсамол павінен даваць адкрытую канкрэтную палітычную ацэнку дзейнасці арганізацыі, яе платформы.

Асноўны крытэрый выбару саюзнікаў — справа і толькі справа. Дзеля перабудовы неабходна знайсці пункты сутыкнення паміж рознымі плынямі моладзі. У нашай агульнай справе камсамол з нефармальнымі арганізацыямі павінен быць разам, каб не згубіць аўтарытэт і актыўных, думаючых людзей.

Камітэт камсамола супраць спажывецкіх адносін да студэнцкага камсамола. Дзяржаўныя і адміністрацыйныя органы не павінны перакладаць на плечы камсамола вырашэнне гаспадарчых задач. Напрыклад, прыцягненне студэнтаў на прымусшальнай аснове (на базы агародніны, бульбу ў час вучобы і пасля яе) адміністрацыйныя органы павінны арганізоўваць самастойна пры наяўнасці законнай асновы і згоды камсамольскай арганізацыі.

Варыянт «камсамол — пажарная каманда» неабходна ліквідаваць па меры ўсталявання новых механізмаў гаспадарання, патрабаваць ад партыйных і гаспадарчых органаў дакладных перспектыў спыніць адцягванне студэнтаў, аспірантаў, маладых супрацоўнікаў ад работы па асноўнай спецыяльнасці.

Камсамол як масавая грамадская арганізацыя не можа замыкацца толькі на вырашэнні сваіх уласных маладзёжных праблем. Найбольш важнымі сярод агульначалавечых камітэт камсамола лічыць: экалагічную, адносін да воінаў-інтэрнацыяналістаў, руху міласэрнасці.

Без дэмакратызацыі ў камсамола няма будучага! Як арганізацыю камсамол нельга ўявіць без унутранай структуры, без арганізацыйных асноў. Бяздумнае капіраванне арганізацыйна-статутных норм са Статута партыі, адставанне арганізацыйных магчымасцей унутры камсамола ад патрэб моладзі ў рэальных дзеяннях, творчасці — гэта было не толькі ў мінулым, але часта сустракаецца і сёння.

У апошні час гучыць нямала прапаноў, крытыкі супраць існуючых стэрэатыпаў унутрысаюзнага жыцця. Напрыклад: магчымасць стварэння камсамольскіх арганізацый не па вытворчаму прынцыпу, а па інтарэсах — у аматарскіх аб'яднаннях, клубах па інтарэсах, сямейных інтэрнатах. Камітэт камсамола гатовы падтрымаць любую разумную ініцыятыву, змагацца за яе рэалізацыю ва ўсіх вышэйстаячых органах, нават у ЦК ВЛКСМ. І прапануе:

— зрабіць паўсядзённай практыку прыняцця рашэнняў у камсамоле па асноўных праблемах з удзелам шырокага кола камсамольцаў, актыву, забяспечыўшы максімальнае прадстаўніцтва камсамольцаў і арганізацый з рознымі інтарэсамі і пунктамі гледжання па абмяркоўваемаму пытанню. У выпадку неабходнасці — да рэферэндума;

— прызнаць за ніжэйстаячымі арганізацыямі (факультэтамі) права самастойна вырашаць, якія напрамкі работы з'яўляюцца для іх асноўнымі, зыходзячы з прафесійнай накіраванасці, традыцыі і спецыфікі камсамольскіх арганізацый;

— фарміраванне выбарных органаў праводзіць, зыходзячы з вылучэння знізу (група, курс), на аснове шырокага абмеркавання сярод камсамольцаў кандыдатур па дзелавых і палітычных якасцях, праграм работы. Пры вылучэнні кандыдатур вышэйстаячымі камсамольскімі і партыйнымі органамі забяспечыць іх шырокае і галоснае абмеркаванне ў ніжэйстаячых арганізацыях. Імкнуцца праводзіць выбары на конкурснай аснове.



«Мнагакніжная Амерыка»

«Кніга — гэта бясцэннае багацце свету і важнейшы набытак пакаленняў і народаў...»

Г. ТАРО,
амерыканскі філосаф, натураліст і пісьменнік.

НЕ ТАК ДАЎНО, недзе гадоў дзесяць-пятнаццаць назад, некаторыя амерыканскія сацыёлагі пераконвалі, нібы у электронны век кніга ў Злучаных Штатах састарэе. Яны прадказвалі, што колькасць кніг рэзка зменшыцца, таму што чытачы аддадуць перавагу тэлебачанню, відэаапаратуры, камп'ютэрам. Аднак тое, што гэтыя прароцтвы не апраўдаліся, пацвердзіла рэзкае павелічэнне продажу кніг у Амерыцы (з 1977 па 1985 год ён узрос амаль у два разы).

Каля 13500 буйных і невялікіх амерыканскіх выдавецтваў штогод выпускаюць больш 51 тысячы назваў новых кніг. Некаторыя з іх і папоўнілі кніжны фонд бібліятэкі нашага універсітэта. Усе яны трапілі сюды з выстаўкі «Мнагакніжная Амерыка», якая праходзіла у Новасібірску, Мінску, Тбілісі.

Шмат намаганняў прыклалі супрацоўнікі бібліятэкі, каб мы з вамі маглі як мага хутчэй пазнаёміцца з літаратурай амерыканскіх выдавецтваў.

У вось 30 лістапада. 11 гадзін раніцы.

У 210-м пакоі галоўнага корпуса мнагалюдна. Асабліва звяртаю ўвагу на замежных студэнтаў, што вучацца ў БДУ. Адкрыццё выстаўкі і тое, што хутка яе экспанаты стануць набыткам чытальных залаў, для іх таксама падзея радасная. Аб гэтым гаварылі і прамоўцы.

— Хачу павіншаваць супрацоўнікаў бібліятэкі з набыццём такой каштоўнай калекцыі кніг,— адзначыў прарэктар па завочнаму і вячэрняму навучанню С. А. Малевіч.— Асабліва парадуюць прысутных кнігі, змешчаныя ў раздзелах грамадска-палітычная, мастацкая, дзіцячая літаратура, геаграфія, мастацтва і іншых. Многія з іх, асабліва па мастацтву, выдатна аформлены, цудоўна ілюстраваны, так што калі чалавек і не ведае англійскай мовы, ён усё роўна атрымае задавальненне ад сустрэчы з прадстаўленымі тут выданнямі.

Гэта выстаўка яшчэ раз паказала, што адносіны паміж СССР і ЗША мацнеюць і становяцца больш шырокімі і рознабаковымі. Ідэя, якая ляжыць у аснове абмену кніжнымі выстаўкамі, у тым, каб праз азнаямленне з літаратурай розных грамадстваў зразумець і ацаніць іх культурныя асаблівасці.

— Жыхары Вашынгтона, Бастона, Лос-Анжэлеса адначасова з новасібірцамі, мінчанамі, тбілісцамі знаёміліся з выстаўкай савецкай літаратуры «СССР: галоснасць і перабудова»,— адзначыў на адкрыцці выстаўкі галоўны рэдактар Дзяржкамвыдата БССР І. М. Лапцёнак.— Эспазіцыі — першы абмен перасовачнымі выстаўкамі паміж СССР і ЗША, арганізаваны па ініцыятыве Дзяржкамвыдата СССР і Інфармацыйнага агенцтва Злучаных Штатаў. Гэта стала магчымым дзякуючы падпісанню ў лістападзе 1985 года Агульнага пагаднення аб абменах у галіне культуры.

Вядучы амерыканскі спецыяліст па рускай літаратуры прафесар Морыс Фрыдберг пераконвае, што нягледзячы на розныя літаратурныя традыцыі, амерыканская і руская літаратуры падобныя ў некаторых важных рысах. На яго думку, амерыканцы шукаюць у рускай, а рускія ў амерыканскай тое, што не знайшло адэкватнага адлюстравання ў іх уласных літаратурных традыцыях. Хто ведае, магчыма таму з мяжой так папулярныя Леў Талстой, Фёдар Дастаеўскі, Максім Горкі, Іван Тургенеў, Аляксандр Пушкін, Барыс Пастэрнак, Яўген Еўтушэнка, Міхаіл Шолахаў і іншыя.



Інтарэс гэты не зніжаецца. Гэта датычыць і беларускай літаратуры. Сярод яе аўтараў найбольш папулярныя Васіль Быкаў, Іван Шамякін.

— Штогод у ЗША мы накіроўваем каля 16 тысяч беларускіх выданняў,— працягвае Ігар Мікалаевіч.— Апошнія сустрэчы на вышэйшым узроўні далі новы імпульс развіццю адносін у галіне культуры, навукі, літаратуры. У прыватнасці, паміж выдавецтвамі «Вышэйшая школа», «Універсітэцкае», «Навука і тэхніка» і некаторымі амерыканскімі выдавецтвамі на Міжнародных кірмашах, што праходзілі нядаўна ў Маскве, заключаны пагадненні аб выданні кніг.

— Спадзяюся, што ў хуткім часе мы будзем мець пастаянную магчымасць знаёміцца з амерыканскай літаратурай у арыгінале,— выказаў намер дзею самы актыўны чытач універсітэцкай бібліятэкі, прафесар мехмата Пётр Пятровіч Забрэйка.— Падставу для гэтага дае і сённяшняя выстаўка. На маю думку, яна вельмі цікавая. У час работы з экспануемай літаратурай мы з першакрыніц даведаемся, напрыклад, аб гісторыі грамадзянскай вайны ў ЗША, аб развіцці эканомікі і г. д. На жаль, мала прадстаўлены найбольш вузкія навуковыя напрамкі — матэматыка, фізіка.

Хочацца верыць, што гэта «першая ластаўка» стане добрым прадвеснікам трывалых дзелавых кантактаў у будучым.

На другі дзень работы выстаўкі я таксама пабывала там. І зноў — гэтак жа мнагалюдна. Ля стэнда з грамадска-палітычнай літаратурай ідзе ажыўленая размова. Аказваецца, многія наведвальнікі добра знаёмыя з літаратурай ЗША. Яны расказваюць аб ролі кнігі ў паўсядзённым жыцці амерыканцаў, аб выдавецкай дзейнасці, прапагандзе кнігі і, безумоўна, аб тым, ці чытаюць у гэтай краіне нашы выданні.

У кнізе водгукаў з'явіліся першыя запісы:

«Такія выстаўкі патрэбна арганізоўваць як мага часцей. Дзякуй работнікам бібліятэкі, а, галоўнае — амерыканскім калегам, якія зрабілі нам такі падарунак».

«Вельмі добрая і патрэбная выстаўка, выдатна прадстаўлены раздзел геаграфіі. Думаю, што вельмі карысна будзе выкарыстоўваць гэтыя кнігі пры вывучэнні Амерыкі».

А вось што напісаў у кнізе водгукаў дацэнт фізфака Л. І. Бураў: «Лічу, што набыццё такой калекцыі — вялікая ўдача для універсітэта. А правядзенне такіх выставак дае прамы доступ да літаратуры. Добра было б наогул правесці выстаўку кніг на замежных мовах, выстаўку рэдкіх кніг і г. д.

А яшчэ патрэбна разгледзець пытанне аб стварэнні пастаянна дзеючай экспазіцыі».

— Прыемна, што сярод наведвальнікаў выстаўкі знайшлося шмат такіх неабыякавых, зацікаўленых людзей,— як бы падводзіць вынік нашай размовы дырэктар бібліятэкі І. У. Арэхоўская.— Мы ўжо зараз думаем над некаторымі прапановамі, якія нам здаюцца найбольш рэальнымі і каштоўнымі. Дарэчы, наведвальнікі прама на выстаўцы мелі магчымасць аформіць заказ на неабходную літаратуру. А гэта значыць, што заказаныя кнігі хутка паявяцца ў чытальных залах — іх мы будзем апрацоўваць у першую чаргу.

Не ўсе кнігі, якія вы бачыце тут, застануцца ў нас. Так званыя няпрофільныя для фонду бібліятэкі, каб не ляжалі мёртвым грузам, мы перададзім Ленінцы, Рэспубліканскай навуковай медыцынскай бібліятэцы.

— У мяне да вас адна просьба,— дадае Ірына Уладзіміраўна.— Пры арганізацыі выстаўкі супрацоўнікам бібліятэкі давялося шмат папрацаваць. Асноўны клопат, безумоўна, лёг на аддзел камплектавання. Але кніг больш семісот, на англійскай мове. Іх неабходна было рассартаваць па аддзелах, а да гэтага даставіць ва універсітэт, потым у выставачную залу. І праз газету я хачу сказаць вялікі дзякуй усім, хто згадзіўся нам дапамагчы. Гэта прафесары А. А. Міхайлаў, Л. М. Шнеерсон, дацэнты Т. Я. Адамовіч, А. М. Коўзік, выкладчык В. А. Кляцкоў, аспірант С. Панькоўскі, а таксама студэнты фізічнага і гістарычнага факультэтаў.

Мы выконваем гэта пажаданне.

А вас, паважаныя чытачы, запрашаем у чытальныя залы на сустрэчу з экспанатамі «Мнагакніжнай Амерыкі».

З. АЛЯШКЕВІЧ.

МЫ ДУМАЕМ, ШТО ПАЗІЦЫЯ КАМСАМОЛА БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА ПАВІННА ЎЛІЧВАЦЬ, АКРАМЯ АГУЛЬНЫХ ПРАБЛЕМ КАМСАМОЛА, РЭАЛЬНУЮ СІТУАЦЫЮ Ў РЭСПУБЛІЦЫ, КАНКРЭТНЫЯ ЗАДАЧЫ І МЭТЫ КАМСАМОЛЬСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА. БЫЛО Б БЕССЭНСОЎНА ДУБЛІРАВАЦЬ ЗМЕШЧАНУЮ ВЫШЭЙ ПРАГРАМУ. НАМ ПАТРЭБНА СВАЯ «НАША ПАЗІЦЫЯ». ЗРАЗУМЕЛА, ШТО БЕЗ ТВАЙГО АСАБІСТАГА ЎКЛАДУ Ў СТВАРЭННЕ ТАКОЙ ПРАГРАМЫ ЯНА СТАНЕ ЗНОЎ-ТАКІ ЧАРГОВЫМ ПАРАДЖЭННЕМ АПАРАТНАЙ СІСТЭМЫ. МЫ, КАМІТЭТ КАМСАМОЛА БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА — ТАЯ САМАЯ АПАРАТНАЯ СІСТЭМА — ПРАПАНОЎВАЕМ ТАБЕ АКАЗАЦЬ НАМ ДАПАМОГУ. ПАЛАЖЭННІ, ЯКІЯ ДРУКУЮЦЦА СЁННЯ, ПАВІННЫ БЫЦЬ АДПРАЎНЫМ ПУНКТАМ РАЗГОРТВАННЯ ДЫСКУСІІ ПА ЎЗНЯТАМУ ПЫТАННЮ НА СТАРОНКАХ «БЕЛАРУСКАГА ЎНІВЕРСІТЭТА», Ў ЖЫЦЦІ ПЯРВІЧНЫХ КАМСАМОЛЬСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ. ТАМУ ШТО Ў БЛІЖЭЙШЫ ЧАС ПЛАНУЕЦЦА РАЗГАРНУЦЬ Ў КРАІНЕ АГУЛЬНАКАМСАМОЛЬСКУЮ ДЫСКУСІЮ ПА ПРАБЛЕМАХ ПЕРАБУДОВЫ Ў КАМСАМОЛЕ. МЫ ПРАПАНУЕМ УСІМ КАМСАМОЛЬЦАМ ЎНІВЕРСІТЭТА ВЫКАЗВАЦЬ СВАЕ ПРАПАНОВЫ НЕ ТОЛЬКІ КАНКРЭТНА ПА ПРАГРАМЕ, АЛЕ І ПА ПЫТАННЯХ ПЕРАБУДОВЫ КАМСАМОЛА.

ПАЗІЦЫЯ • НАША ПАЗІЦЫЯ • НАША

АБ УНІВЕРСІТЭЦКАЙ АДУКАЦЫІ

Існуючая сёння ў БДУ сістэма адукацыі, нягледзячы на пачатыя пераўтварэнні, у многім не адпавядае сучасным патрабаванням.

Камітэт камсамола лічыць, што ўдасканаленне вучэбнага працэсу павінна весціся па наступных напрамках:

1. Стварэнне ўмоў для жадаючых вучыцца, а не прымус тых, хто не хоча ці не можа;

2. Забеспячэнне высокай якасці лекцыйных, семінарскіх і практычных заняткаў;

3. Перагляд вучэбных планаў і праграм, якія б акцэнтавалі ўвагу на індывідуалізацыі навучання, магчымасці выбару розных курсаў;

4. Увядзенне вольнага наведвання лекцый для ўсіх студэнтаў, акрамя першага курса, заняткаў па індывідуальных планах;

5. Змена дзеючага механізму кантролю, у тым ліку магчымасць увядзення сістэмы здачы экзаменаў экстэрнам па асобных раздзелах курса і вызваленне студэнтаў ад выніковага экзамена ў выпадку паспяховай здачы прамежкавых экзаменаў або залікаў.

АБ ПРАБЛЕМАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ, КУЛЬТУРЫ, ГІСТОРЫІ

Камітэт камсамола лічыць, што неад'емнай часткай універсітэцкай адукацыі з'яўляецца веданне роднай мовы, гісторыі народа, яго культуры. Аднак мы супраць прымусовага, «з сёння на заўтра», увядзення беларускай мовы ва універсітэце. Мы прапануем:

— увядзенне на ўсіх факультэтах універсітэта курсаў лекцый па гісторыі і культуры БССР на беларускай мове;

— перагляд праграм педагагічных патокаў з улікам таго, што большасць выпускнікоў гэтых спецыяльнасцей будзе працаваць у школах з беларускай мовай навучання;

— камсамольскай арганізацыі супрацоўнікаў і выкладчыкаў арганізаваць агульнаўніверсітэцкі клуб па праблемах беларускай мовы, літаратуры і гісторыі і правядзенне на яго аснове дыскусій, дыспутаў, «круглых сталоў» і іншых мерапрыемстваў з мэтай вывучэння і прапаганды;

— супрацоўніцтва з нефармальнымі аб'яднаннямі гісторыка-культурнага і краязнаўчага напрамку, падтрымка станоўчых момантаў у іх дзейнасці;

— выйсці з дадатковымі канкрэтнымі прапановамі па гэтаму пытанню ў камісію рэктарата і парткома па развіццю беларуска-рускага двухмоўя.

АБ РАБОЦЕ Ў ВУЧОНЫХ САВЕТАХ

1. Камітэт камсамола лічыць, што прадстаўніцтва студэнтаў у вучоных саветах факультэтаў і універсітэта з'яўляецца важнейшай формай удзелу студэнцкага калектыву ў кіраванні справамі універсітэта.

2. Работа студэнтаў у вучоных саветах пакуль яшчэ неэфектыўная: недастатковая актыўнасць студэнтаў у пастаноўцы пытанняў, абумоўленая галоўным чынам адсутнасцю неабходнага вопыту і іх нізкай кампетэнтнасцю ў многіх праблемах.

3. Лічым неабходным праводзіць сістэматычную вучобу студэнтаў — членаў вучоных саветаў і просім рэктарат аказаць дапамогу ў арганізацыі такой вучобы.

4. Камітэт камсамола лічыць мэтазгодным даручыць камсамольцам — членам вучонага савета БДУ вынесці на пасяджэнні савета пытанні:

— аб сельгасработах;

— аб фарміраванні бюджэту універсітэта і вылучэнні сродкаў на патрэбы моладзі;

— аб выкладанні грамадскіх дысцыплін;

— аб стане грамадскага харчавання.

АБ РАБОЦЕ СА ШКОЛЬНІКАМІ

Важнай справай камсамола ў рэалізацыі рэформы сярэдняй і вышэйшай школы павінен стаць клопат аб выяўленні талентаў сярод школьнікаў і падрыхтоўцы іх да паступлення ў БДУ.

Камітэт камсамола лічыць неабходным:

а) камсамольскім арганізацыям факультэтаў арганізоўваць шэфства над базавымі школамі з мэтай стварэння шырокай сеткі гурткоў рознага профілю; рэалізацыю ідэй «педагогікі супрацоўніцтва»;

б) сумесна з рэктаратам ажыццявіць падбор педагагічных кадраў для школы-інтэрната фізіка-матэматычнага профілю, якая ствараецца пры БДУ;

в) узяць шэфства над школамі юных, правядзеннем прадметных алімпіяд;

г) арганізаваць пастаянна дзеючыя семінары для настаўнікаў школ г. Мінска па вучэбных прадметах, праблемах вучнёўскага самакіравання.

АБ СТАНЕ МАТЭРЫЯЛЬНА-ТЭХНІЧНАЙ БАЗЫ УНІВЕРСІТЭТА

Выкананне прынятай ЦК КПБ і ўрадам рэспублікі пастановы аб развіцці БДУ дазволіць да 2000 года падняць матэрыяльна-тэхнічную базу універсітэта на сучасны ўзровень.

Аднак сёння становішча з плошчамі і забеспячэннем сучасным абсталяваннем на філалагічным факультэце, факультэтах журналістыкі і прыкладной матэматыкі крытычнае.

Камітэт камсамола лічыць, што рэктарату неабходна прыняць неадкладныя меры па вырашэнню наступных пытанняў (нават калі для гэтага патрэбна будзе звяртацца ў ЦК КПБ):

— перадача філалагічнаму факультэту будынка Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ (ці іншага памяшкання);

— перадача факультэту журналістыкі памяшкання БДІНГ па вул. Свярдлова (ці іншага памяшкання);

— паскоранае аснашчэнне вылічальнай тэхнікай факультэта прыкладной матэматыкі;

— пры стварэнні на базе БДУ навукова-даследчых падраздзяленняў, ФПК, ІПК, курсаў удасканалення патрабаваць выдзялення дадатковых плошчаў.

АБ ІНТЭРНАТАХ

Існуючыя ўмовы пражывання ў інтэрнатах

(Заканчэнне на 4-й стар.).

МАЙСТЭРНЯ ЗДАРОЎЯ

Па перакананню намесніка галоўнага ўрача 33-й паліклінікі ***АЛЬДОНЫ АФАНАСЬЕЎНЫ ФАМІНОЙ*** *вялікай розніцы паміж студэнцкай і звычайнай паліклінікай не існуе: і тут, і там лечаць хворых. Хіба што ў катэгорыі пацыентаў.*

А студэнтаў, між іншым, у нашым горадзе 76 тысяч. Гэта навучэнцы 13 вышэйшых навучальных устаноў і 14 тэхнікумаў.

ВРЗ баяцца...

— І многа ў вас наведвальнікаў?

— Калі параўнаць з людзьмі больш старэйшага ўзросту, то студэнты хварэюць намнога радзей. Сярод іх нядугаў пераважаюць вострыя рэспіраторныя захворванні (ВРЗ) — каля 85—90 працэнтаў. Тут, дарэчы, вінаваты самі маладыя людзі: на дварэ холад, а яны ходзяць лёгка апранутыя, без шапак. Іншыя, калі інстытут непадалёку ад інтэрната, дык зусім могуць без верхняга адзення бегаць сюды-туды. Дарослыя ж людзі, павінны хоць крыху клапаціцца аб сваім здароўі.

Сярод навучальных устаноў самыя «прадукцыйныя» (у сэнсе захворванняў) кансерваторыя, тэатральна-мастацкі інстытут, МДПІЗМ. Сярод факультэтаў нашага універсітэта — хімфак, мехмат, журфак.

— Вось вам сітуацыя: чалавек хворы, тэмпература 37—38 градусаў, на вуліцы холадна. Чарга за талонамі з паловы восьмай. Не кожны фізічна можа ў ёй выстаяць. Ды можа здарыцца і такое, што талонаў няма. Што ж яму рабіць?

— Выклікаць урача дамоў. Хто жыве ў інтэрнаце — з нашай паліклінікі, а астатнім — з тэрытарыяльнай. Дарэчы, пацыента з вялікай тэмпературай урач абавязаны прыняць без чаргі і без талона, праводзячы афармленне на месцы.

Талон жа можна заказаць па тэлефоне, а потым прыйсці на прыём у прызначаны тэрмін. Існуе таксама папярэдні запіс. Праўда, пакуль толькі да гінеколага і неўрапатолага.

— Скажыце, чаму, калі студэнт прыходзіць за даведкай або за вызваленнем ад фізкультуры, на яго глядзяць як на закаранелага прагульшчыка? У чым карані такой псіхалогіі?

— Даведку, якая дазваляе часова не прысутнічаць на занятках, урач дае, калі бачыць, што студэнт па стану здароўя сапраўды не можа вучыцца ў гэты час. Вызваленне (часовае) ад фізкультуры студэнт атрымлівае ў выпадку катаральных з'яў. Але, на жаль, вельмі часта студэнты «набіваюць» тэмпературу, выклікаюць кашаль, катар і г. д. Каторацей, сімулююць хваробу, толькі б атрымаць запаветную даведку.

Мы заўсёды імкнемся уважліва ставіцца да пацыентаў, аднак такія негатыўныя з'явы прымушаюць нас быць падазорнымі і з недаверам ставіцца да некаторых наведвальнікаў.

— Як на ваш погляд, ці дасканалая сістэма абследавання і лячэння ў паліклініцы?

— Мы карыстаемся састарэлай тэхнікай, абсталяваннем. На розных узроўнях цяпер гавораць аб тым, што ахове здароўя не надаюць належнай увагі. Праўда, апошнім часам у дваццаці васьмі паліклініках былі створаны дыягнастычныя цэнтры. А хацелася б (у перспектыве так і намячаецца) каб у кожным раёне быў свой.

Для лячэння «любімай» хваробы студэнтаў — ВРЗ мы маем усё неабходнае.

— У Мінску, у тым ліку і ў БДУ, вучыцца шмат замежных студэнтаў. Як праводзіцца прафілактыка СНІДа?

— Растлумачальная работа вялася заўсёды. Замежнікі абследуюцца на СНІД на граніцы, калі едуць да нас, і перад канікуламі, калі пакідаюць Савецкі Саюз. Выяўленне носьбітаў гэтай хваробы праводзіцца шляхам імуна-ферментнага аналізу крыві. Пры атрыманні траекратна-станоўчай рэакцыі чалавек дэпартыруецца з СССР. У мінулым годзе сярод іх было 13 студэнтаў, у гэтым — пяць.

— СНІД перадаецца і праз кроў. Таму студэнты палохаюцца шпрыцоў шматразовага карыстання, баяцца лячыцца ў стаматолага...

— СНІД перш за ўсё перадаецца палавым шляхам. Вось чаго патрэбна пазбягаць. Існуе магчымасць заражэння праз донарскую кроў. Але працэнт верагоднасці вельмі малы — яна ж даследуецца.

А наконт шпрыцоў, інструментаў стаматолага — трывога надуманая. У час ін'екцый замежным студэнтам выкарыстоўваюцца шпрыцы аднаразовага карыстання. Вірус, да таго ж, нястойкі ў знешнім асяроддзі, тым больш, што ўсе медыцынскія інструменты праходзяць апрацоўку.

— Замежныя студэнты часам наракаюць: чаму ім нельга вырашаць многія пытанні ў паліклінічным аддзяленні пры навучальнай установе, як савецкім...

— У замежнікаў ёсць свой участковый ўрач. А знаходзіцца ён у будынку нашай, 33-й паліклінікі. Гэта зроблена для зручнасці як медыкаў, так і замежных студэнтаў. Па-першае, участковы тэрапеўт вельмі загружаны работай з савецкімі студэнтамі. Па-другое, зручней, калі адзін урач вядзе справы аднаго кантынгента. Па-трэцяе, тут лепшыя ўмовы абслугоўвання, а пры неабходнасці можна звярнуцца і да іншых спецыялістаў.

— Вашы парады студэнтам?

— Глядзіце за сваім здароўем. І памятайце: хваробу лягчэй папярэдзіць, чым лячыць.

Гутарку вяла
Л. ПРАЎЛОЦКАЯ,
наш няшт. кар.



ЗІМОВЫ ВЕРНІСАЖ
Фота В. ІВАНОВА.

АДБЫЛОСЯ Ў ЛІСТАПАДЗЕ

АБ ПАЎЗАХ І ПАКІНУТЫХ СЛЯДАХ

— Вельмі хачу, каб пяцікурснікі яшчэ доўгі час не пакідалі наш тэатр,— віртуозны выканаўца варыяцый на тэму песні «ВВС» (калі вы глядзелі фільм «Асса»), ён жа — Штырліц у спадніцы (калі памятаеце «Сямнаццаць імгненняў...»), а ў жыцці — студэнт трэцяга курса юрфака Андрэй Ермалінскі ў дзень таго спектакля быў надзвычайны. 26 лістапада, калі юрфак святкаваў вечар пяцікурснікаў, Андрэю споўнілася роўна дваццаць тры гады:

— Сяголетняя васьмёрка пяцікурснікаў — сумленне нашага калектыву, яго душа. Яны былі першапраходцамі. І, як жартуюць, выпакутавалі СТЭМ уласнымі залікоўкамі, вольным часам і вялікімі нервамі. Колькі разоў тэатр закрывалі!

Тады іменна пяцікурснікам даводзілася ставіць яго на ногі і зноў вучыць хадзіць. Таму так цяжка развітваюцца са СТЭМам. Я, напрыклад, і не збіраюся. Тут свабода ад абставін, разняволенне, творчая атмасфера і саўдзел у праблемах сяброў.

— Я хвалююся, пачакайце! — яна сядзела на першым радзе і сачыла за выступленнем СТЭМа. На сцэне працавалі сяброўкі Алены Саверчанка:

— Я ўжо на пятым. Толькі не юрыдычнага, а механіка-матэматычнага. А студэнцкае жыццё маё працягваецца сёмы год. Займалася «вялікім» спортам — ў баскетбольнай камандзе «Гарызонт». Даводзілася прапускаць заняткі. У выніку — пачынай спачатку вучэбны год. Цяпер у дадатак да асноўнай працы — вучобы — займаюся выхаваннем дачкі Кацюшы. Таму і цяжкасцей удвая больш: частыя хваробы Каці, трэніроўкі ў баскетбольнай камандзе універсітэта. Але бесклапотнае жыццё наўрад ці можа быць вясёлым і цікавым. Шкадую толькі, што хутка давядзецца развітвацца.

— За год, у які я пачаў працаваць, многае змянілася. Моладзь, як ні дзіўна, зрабілася цішэйшай,— народны суддзя Маскоўскага раёна, выпускнік юрфака 1987 года Ігар Коваль так удала танцаваў на дыскатэцы, што не падысці да яго з пытаннем я проста не змог.

— У мінулыя гады было больш гоману, вяселля. Здаецца, жыццё мы ўспрымалі спачатку сэрцам, а потым розумам.

Тры погляды на пяцікурснікаў юрфака. Зацікаўлены ў Алены. У Андрэя і Ігара супярэчлівыя. Свой уласны я прытрымаў наўмысна. На сцэне пяцікурснікаў так і не дачакаўся. Баяліся не пратрымацца некалькі хвілін ці не паспелі падрыхтавацца? Не знайшлі часу і месца ці не пажадалі збірацца разам? Магчыма, пабочнаму назіральніку, тым больш, першакурсніку нетактоўна рабіць заўвагі. Таму я закончваю пытаннем да пяцікурснікаў: «А што калі паўза на сцэне ў час вашага ж свята застанецца адзіным успамінам для выкладчыкаў і студэнтаў малодшых курсаў?»

І. ПАЛЯШЧУК,
студэнт факультэта журналістыкі.

ПАЗІЦЫЯ • НАША ПАЗІЦЫЯ • НАША ПАЗІЦЫЯ

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й, 2-й і 3-й стар.).

з'яўляюцца крытычнымі. Груба парушаны санітарныя нормы, няма базы для заняткаў спортам і адпачынку. Тры гады вядзецца рамонт інтэрната № 4, у аварыйны стан прыйшоў інтэрнат № 1. Цякучыя рамонты ў некаторых з іх вядуцца ў час вучобы.

Камітэт камсамола лічыць неабходным:

— рэктарату пры развіцці матэрыяльна-тэхнічнай базы універсітэта перавагу аддаваць будаўніцтву інтэрнатаў;

— аказаць дапамогу АГЧ шляхам стварэння студэнцкіх атрадаў і рамонтных брыгад для рамонту інтэрнатаў.

АБ СТУДЭНЦКІХ АТРАДАХ

Пры фарміраванні студэнцкіх атрадаў БДУ:

— кіравацца прынцыпам добраахвотнасці;

— хадайнічаць перад абласным штабам аб памяншэнні колькасці ЛСА, што працуюць у Мінскай вобласці, да пятнаццаці чалавек;

— па магчымасці дазваляць студэнтам, што едуць у студатрады, праходжанне вучэбнай практыкі на працягу семестра.

АБ СЕЛЬГАСРАБОТАХ

Праблема арганізацыі асенніх сельскагаспадарчых работ ва універсітэце стаіць вельмі востра. Гэта кампанія парушае вучэбна-выхаваўчы працэс і супярэчыць рашэнням люцтаўскага (1988 г.) Пленума ЦК КПСС.

У сувязі з тым, што сельскай гаспадарцы рэспублікі ўсё ж і ў далейшым патрэбна будзе дапамога студэнтаў, камітэт камсамола лічыць неабходным:

а) на пасяджэнні вучонага савета універсітэта разгледзець пытанне аб сельгасработах;

б) падрыхтаваць запіску ў ЦК КПБ, у якой прааналізаваць недахопы ў арганізацыі сельгасработ і ўнесці наступныя прапановы, якія, на наш погляд, дапамогуць навесці ў гэтай справе парадак;

— вырашыць пытанне аб перадыслакацыі ССГА з Магілёўскай у Мінскую вобласць;

— да 1 красавіка 1989 года замацаваць на доўгатэрміновай аснове за кожным факультэтам канкрэтны раён;

— перайсці па прыкладу студэнцкіх атрадаў да дагаворных адносін «факультэт — раён». Распрацаваць палажэнні дагавору;

— пры заключэнні дагавору прадугледжваць, каб прымаючыя гаспадаркі адлічвалі на рахунак універсітэта сродкі з разліку 36 руб. за студэнта (затраты БДУ ра кожнага студэнта ў месяц);

в) рэктарату вырашыць пытанне аб тым, каб пасылаць на сельгасработы студэнтаў толькі аднаго курса. Кіраўнікамі груп накіроўваць выкладчыкаў факультэта, якія будуць весці заняткі на даным курсе;

г) заняткі на астатніх курсах пачынаць з 1 верасня, а для студэнтаў, што выязджалі ў СА,— з 7 верасня (па іх жаданню).

АБ ГАЛОСНАСЦІ

Поўная галоснасць ў рабоце камітэта камсамола з'яўляецца неад'емнай часткай дэмакратызацыі ўнутрысаюзнага жыцця. Камітэт камсамола лічыць неабходным публікаваць:

— рашэнні бюро і пасяджэнняў камітэта камсамола ў газеце «Беларускі універсітэт» і насценным друку;

— штоквартальную інфармацыю аб паступленнях камсамольскіх узносаў і прыцягнутых сродках, каштарыс расходаў і справаздачу аб расходаванні фінансавых сродкаў камсамольскай арганізацыі універсітэта;

— актывізаваць работу прэс-цэнтра пры камітэце камсамола з мэтай аператыўнага інфармавання студэнтаў і супрацоўнікаў па розных пытаннях грамадска-палітычнага жыцця рэспублікі.

АБ ВЫБАРАХ Ў САВЕТЫ НАРОДНЫХ ДЭПУТАТАЎ

Камітэт камсамола лічыць неабходным, каб камсамольская арганізацыя універсітэта мела сваіх прадстаўнікоў ва ўсіх Саветах, у тым ліку і ў Вярхоўным Савеце БССР.

Разгарнуць перадвыбарную кампанію па вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты ўсіх узроўняў цераз рэспубліканскую прэсу, газету «Беларускі універсітэт», насценны друк і г.д.

Распрацаваць перадвыбарную платформу.

АБ АДНОСІНАХ ДА ГРАМАДСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ

Мы асуджаем існуючую зараз практыку перакладвання функцый ДНД, ДТСААФ і іншых грамадскіх арганізацый на камітэт камсамола.

Мы выступаем за раўнапраўнае супрацоўніцтва і заклікаем кіраўніцтва гэтых арганізацый будаваць сваю работу на асновах раўнапраўя, галоснасці і добраахвотнасці.

АБ ФІНАНСАВА-ГАСПАДАРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Сёння ў камітэта камсамола з'явіліся новыя магчымасці ў развіцці фінансава-гаспадарчай дзейнасці (арганізацыя прадпрыемстваў, кааператываў, аматарскія аб'яднанні, цэнтр НТТМ). Іх неабходна актыўна выкарыстоўваць. Разам з тым існуючая фінансава-гаспадарчая сістэма не задавальняе камсамол.

Мы прапануем:

— выйсці ў ЦК ЛКСМБ з прапановай пакідаць у пярвічных камсамольскіх арганізацыях да 40 працэнтаў узносаў;

— усе прыцягнутыя сродкі, зароблены камсамольцамі на суботніках, у СА, пакідаць у распараджэнні камітэтаў камсамола факультэтаў, універсітэта:

— увесці галоснасць аб расходаванні сродкаў на ўсіх узроўнях — ад ЦК камсамола да пярвічных арганізацый.

АБ АДПАЧЫНКУ

Пры камітэце камсамола створаны Маладзёжны студэнцкі цэнтр аматарскіх аб'яднанняў. Гэта дае магчымасць існуючым калектывам, аматарскім аб'яднанням быць гаспадарча-разліковымі арганізацыямі і вырашаць фінансавыя пытанні. Мы лічым неабходным усямерна падтрымліваць аматарскія маладзёжныя аб'яднанні, якія яшчэ ствараюцца, студэнцкія тэатры і агітбрыгады, забяспечваць умовы для іх нармальнага функцыянавання.

АБ ІНТЭРСПРАВАХ

Камсамольская арганізацыя універсітэта надае важнае значэнне рабоце па інтэрнацыянальнаму выхаванню савецкіх і замежных студэнтаў.

Камітэт камсамола:

— лічыць, што лепшая прапаганда дасягненняў сацыялізму за мяжой ва ўмовах нашага універсітэта — высокі ўзровень падрыхтоўкі замежных студэнтаў;

— выступае за рэальную роўнасць становішча замежных і савецкіх студэнтаў пры ацэнцы якасці ведаў, разборы канфліктных сітуацый;

— працягне супрацоўніцтва з арганізацыямі і зямляцтвамі замежных студэнтаў ва універсітэце на аснове двух- і трохбаковых дагавораў і планаў сумеснай работы;

— будзе пашыраць супрацоўніцтва з арганізацыямі братніх сацыялістычных краін у пытаннях навукова-даследчай работы, у выкананні мэтавай праграмы «Супрацоўніцтва», у абмене вопытам работы маладзёжных арганізацый па ўсіх напрамках;

— будзе імкнуцца да максімальнага прыцягнення замежных студэнтаў, што вучацца ва універсітэце, да ўдзелу ў будатрадаўскім руху;

— выступае за расшырэнне абмену інтэратрадамі з ВНУ сацыялістычных краін, абменаў студэнтамі ў рамках існуючых дагавораў і дагавораў, якія будуць заключаны, з ВНУ-партнёрамі за мяжой;

— выступае за такі прынцып інтэрнацыянальнага рассялення, пры якім савецкія і замежныя студэнты самі выбіраюць, з прадстаўніком якой краіны ім жыць у пакоі, за замацаванне пакояў за студэнтамі на ўвесь перыяд навучання.

КАМІТЭТ КАМСАМОЛА.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
8 снежня.
Зак. 1639.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

В. а. рэдактара
М.Г. ЗАГОРСКАЯ.